ТРАДИЦИИ

*Этот концерт приносит в их души легкую грусть оттого что пришло время расставаться с университетской сценой, ставшей за студенческие годы такой близкой и родной. Здесь, тепло принимаемые зрительской аудиторией, они испытали чувства окрыленности и вдохновения.*

# «... ЭТО БЫЛИ ЛУЧШИЕ ГОДЫ НАШЕЙ ЖИЗНИ»

В конце каждого учебного года по доброй традиции в университете чествуют активных и талантливых пятикурсников, чья студенческая жизнь была наполнена не только учебой, но и выражением творческих, организаторских способностей в общественной работе, в самых разных коллективах студенческого клуба.

В конце мая 30 студентов, выпускников 2003 г. – активистов БРСМ, профсоюзной работы, а также самодеятельных певцов, танцоров, актеров, тех, кто обеспечивал техническую сторону университетских творческих мероприятий, тепло приветствовали на сцене актового зала ректор ГГУ профессор М.В. Селькин и председатель профкома студентов Н.И. Колтышева. Студенческие годы, как подчеркнули они в своих словах благодарности и напутствия выпускникам, дали им не только знания по избранной специальности, но и творческое горение, угаснуть которому не суждено и в дальнейшей их самостоятельной жизни. Вручение Почетных грамот университета и денежных премий стало заслуженной оценкой разносторонних способностей активистов общественной и культурной жизни ГГУ.





А отчетный концерт за прошедший учебный год, в котором приняли участие и многие виновники торжества, и те, у кого студенческая жизнь еще в самом разгаре, стала ярким подтверждением того, насколько богата талантами молодежь. Звучали песни в прекрасном исполнении дипломантов и участников многих престижных международных конкурсов и фестивалей – Татьяны Герда (факультет психологии), Веры Чернявской (факультет иностранных языков), Татьяны Ковалевой (экономфак); грацией, изяществом, мастерством радовали зрителей участницы ансамбля эстрадного танца «Коктейль» (руководитель Е. Зарайский), шоу-балета «Вида» (рук. Т. Волынская, факультет психологии), зажигательными ритмами «завели» зал призеры многочисленных конкурсов бальных танцев Инга Кулыба и Александр Степанов. И как всегда нельзя было удержаться от смеха во время выступления СТЭМа «СанТехЭлектроМонтаж», где прекрасно исполнил свои роли победитель конкурса «Мистер университета 2003» Александр Михальков (юридический факультет). Очень тепло приветствовал зал и народную хоровую капеллу «Денница» (рук. Н. Козлов), ансамбль фольклорной песни «Валошкі» (рук. А. Эбзеева) и многих других солистов и коллективы. Были и прекрасные премьеры: одной из них стал новый танец в исполнении участников народного фольклорно-хореографического ансамбля «Радимичи».

Будут помнить в ГГУ и прекрасного организатора, вдохновителя многих университетских развлекательных программ культорга исторического факультета Инну Зюрину, которая и сама была их активной участницей, и победительницей межвузовского конкурса «Alma mater» на фестивале «Арт-сессия-2002».

Не могли не выразить нахлынувших на них чувств и сами пятикурсники. Многие из них подходили к микрофону, чтобы сказать слова благодарности и признательности родной Alma mater, студенческому клубу, и все были солидарны в одном, что выразилось в произнесенной фразе: «Это были лучшие годы нашей жизни».

... Перелистаны с помощью работников студенческого клуба – его художественного руководителя Марины Ширинкиной и режиссера Антонины Давыдовой лучшие страницы концертного сезона прошедшего учебного года, а впереди – новые репетиции, успехи, победы. На смену нынешним пятикурсникам, внесшим свой весомый вклад в копилку творческих достижений ГГУ, придет не менее талантливая и активная молодежь. Значит, будут продолжаться лучшие традиции нашего вуза.

**Т.НИКОЛАЕВА.**

**НА СНИМКАХ: 1. Ректор ГГУ, профессор М.В. Селькин вручает Почетную грамоту университета пятикурснице факультета психологии и довузовской подготовки, председателю студсовета общежития №2 Ольге Рудавской; 2. Выпускники-2003 г. после церемонии награждения.**

**Фото В. ЧИСТИКА.**

# И для красоты, и для учебы

***Биологический факультет активно включился в проведение Года порядка и благоустройства на Земле.***

Большая помощь в этом оказана Гомельским областным комитетом природных ресурсов и охраны окружающей среды, который выделил финансовые средства на поддержание и расширение экологического воспитания и образования студентов. Приобретены и посажены многолетние декоративные растения, кустарники и деревья между учебными корпусами университета по улице Советской и возле общежития №1. Общее их количество превысило 300 шт. Созданные одиночные, групповые посадки и цветочные устройства различных видов будут использоваться для выполнения курсовых и дипломных работ студентами, которые специализируются на кафедре ботаники и физиологии растений по вопросам биологии видов и озеленения территорий.

В Центральном ботаническом саду (г. Минск) приобретена коллекция декоративных комнатных растений, некоторые из них вы видите на снимке. Их более 70 видов, в том числе и крупных форм (пальмы и лианы). На протяжении многих лет коллективом преподавателей проводится работа по разведению и размножению комнатных растений общедоступного ассортимента, включающего около 60 видов, в помещениях и аудиториях факультета. А общее количество комнатных растений на биофаке превысило 350 единиц. Данная коллекция послужит базой для обучения студентов по ряду дисциплин и спецкурсов, а также будет использована для выполнения курсовых и дипломных работ по биологии и экологии видов комнатных растений, позволит в будущем развивать новые научные направления.

В учебном корпусе №1 планируется создание оранжереи, которую смогут посещать студенты, школьники, воспитанники детских дошкольных учреждений и гости университета.

**С. ЖАДЬКО,**
***ассистент кафедры ботаники и физиологии растений.***

**ОТ РЕДАКЦИИ:** высаженные на территории университета кустарники, многолетние декоративные растения требуют тщательного ухода и бережного отношения. Давайте же будем сообща сохранять эту зеленую красоту.



СЛОВА – ВЫПУСКНІКУ

# З КРАІНЫ ПАДРУЧНІКАЎ – У КРАІНУ ЛЕГЕНД І ПАДАННЯЎ

Вось і падышоў да заканчэння яшчэ адзін навучальны год ва універсітэце. І калі ў некаторых студэнтаў малодшых курсаў яшчэ ідзе экзаменацыйная сесія, то ў выпускнікоў зусім хутка пачнецца самастойнае працоўнае жыццё. Пэўна, перад кожным з цяпер ужо маладых спецыялістаў час ад часу паўставала пытанне: з чым жа для мяне асабіста асацыіруецца універсітэт, які стаў родным за пяць год навучання? Тут адназначна і не адкажаш. Успамінаюцца і сесіі з памятным "днём ліквідацыі запазычанасцей", і бяссонныя ночы з падручнікам на першым курсе, і такія ж бяссонныя, толькі ўжо ў дыскаклубах – на пятым. Шмат успамінаў пакінула і педагагічная практыка, калі па-сапраўднаму пачынаеш адчуваць сябе настаўнікам, і летнія – фальклорная, потым дыялекталагічная. А колькі мерапрыемстваў давялося пабачыць у актавай зале універсітэта: Дні факультэтаў, фестываль "Арт-сесія", традыцыйныя конкурсы "Ану, першакурснік!" і "Містэр універсітэта" – усё і не пералічыць.

Для мяне ж асабіста больш за ўсё запамінальным аказаліся экскурсійныя паездкі, якія штогод арганізуюцца на філалагічным факультэце. Іх геаграфія даволі шырокая – Нясвіж і Мір, Полацк і Віцебск, Гродна і Брэст, а таксама "Хатынь", "Дудуткі", Мінск, Кіеў, Навагрудак, вёска Глінішчы Хойніцкага раёна – радзіма класіка беларускай нацыянальнай літаратуры Івана Мележа. Гарады і пасёлкі, абласныя цэнтры і вёсачкі, што пакінулі часцінку сябе ў нашых сэрцах. Вось і гэтай вясной тройчы студэнты філалагічнага факультэта накіроўваліся на экскурсіі, знаёміліся з помнікамі архітэктуры старажытнасці – Нясвіжскім і Мірскім замкамі, помнікамі культуры Навагрудчыны з апетым А. Міцкевічам возерам Свіцязь, Кіева-Пячорскімі лаўрамі, жамчужынай Беларусі – Полацкай Сафіяй і шматлікімі музеямі і памятнымі мясцінамі.

Трэба сказаць, што трымаецца гэты пачын на асабістай ініцыятыве студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Вялікі дзякуй трэба сказаць за арганізацыю і правядзенне літаратурных экскурсій выкладчыку кафедры беларускай літаратуры В.С. Генаш, асаблівую ўдзячнасць хацелася б выказаць намесніку дэкана па вучэбнай рабоце Л.П. Кузьмічу, студэнтцы групы БА-23 Марыне Савіцкай і ўсяму студэнцкаму аргкамітэту філфака. Арганізацыя любой з экскурсій – справа карпатлівая. Трэба вырашаць шмат пытанняў і ўдакладняць шмат акалічнасцей. Ды што гэта ў параўнанні, скажам, з таямніцамі Мірскага замку, дзе група студэнтаў пабывала ўжо сёлета, ці з Полацкім Сафійскім саборам?!!! Дакрануцца да сваёй гісторыі, адчуць пах даўніны і, безумоўна, весела і з карысцю правесці час – такія задачы, на маю думку, на экскурсіях заўсёды ўвасабляюцца ў жыццё. Яскравае пацвярджэнне гэтаму – стос каляровых фотаздымкаў, што захоўваюцца і ў студэнтаў, і на факультэце, а таксама найлепшыя ўражанні.

Вядома, матэрыялу пра кожную з экскурсій асобна хапіла б не на адзін газетны артыкул. Вялікая карысць з іх студэнтам, асабліва, першакурснікам. Напрыклад, вывучаючы курс старажытнай беларускай літаратуры, увачавідкі пазнаёміліся яны і з помнікамі культуры старажытных Полацка, Навагрудка, Кіева, шмат даведаліся пра такіх выдатных асоб як Ефрасіння Полацкая і Францыск Скарына, Сымон Будны і Сімяон Полацкі, Адам Міцкевіч і Мікола Гусоўскі, дакрануліся да гісторыі ў вобразах мураваных замкаў і паркавых комплексаў, што бачылі на сваім вяку войны і рэвалюцыі, росквіт і заняпад.

А мне хочацца адзначыць: традыцыю арганізацыі і правядзення экскурсій трэба працягваць як на філалагічным факультэце, так і на іншых. Менавіта такой і павінна быць вучоба ва універсітэце – насычанай і разнастайнай.

**Сяргей АРЦЁМАЎ,**
**студэнт 5 курса філалагічнага факультэта.**

ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПАВЫШАЦЬ САЦЫЯЛЬНА-ПРАВАВЫ СТАТУС ВЫКЛАДЧЫЦКІХ КАДРАЎ

**У маі бягучага года ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, Гомельскім абкамам галіновага прафсаюза вывучана сумесная работа прафкамаў і рэктаратаў ГДУ імя Ф. Скарыны, Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта па павышэнні сацыяльна-прававога статусу прафесарска-выкладчыцкіх кадраў.**

Па выніках праверкі прынята адпаведная пастанова. У ёй адзначаецца станоўчая роля прафсаюзных камітэтаў і рэктаратаў праверaных ВНУ, Гомельскага абкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі па паляпшэнні сацыяльнага становішча выкладчыкаў, павышэнні іх статусу і творчага патэнцыялу. Уся работа вядзецца на аснове развіцця сацыяльнага партнёрства праз рэалізацыю калектыўных дагавораў паміж рэктаратамі і прафкамамі ВНУ і галіновага пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Ажыццёўлены шэраг мер па аздараўленні прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, стварэнні для іх бяспечных умоў працы, арганізоўваецца конкурс на лепшую прафсаюзную групу. Праведзена пэўная работа па азнаямленні прафактыву, прафесарска-выкладчыцкага саставу са зместам Рэкамендацый ЮНЕСКА аб статусе выкладчыцкіх кадраў ВНУ і выкарыстанні іх у практычнай рабоце.

Разам з тым, адзначаецца ў пастанове, калектыўныя дагаворы і іх дадаткі неабходна дапрацаваць у адпаведнасці з рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі і ЦК галіновага прафсаюза. Патрабуе канкрэтызацыі палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні працы. Сярэдняя заработная плата прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ па выніках 2002 г. і першага квартала 2003 г. ніжэйшая за памеры сярэдняй заработнай платы выкладчыцкіх кадраў па Рэспубліцы Беларусь, у той час як сярэдняя вучэбная нагрузка выкладчыкаў ГДУ ў бягучым навучальным годзе вышэйшая за сярэднюю вучэбную нагрузку выкладчыцкіх кадраў ВНУ сістэмы Міністэрства адукацыі.

Патрабуюць таксама ўвагі прафсаюзных камітэтаў і рэктаратаў пытанні забяспечанасці выкладчыцкіх кадраў жыллём; пашырэння доступу іх да міжнародных камп'ютэрных праграм, вучэбна-метадычных і інфармацыйных рэсурсаў, якія неабходны для іх выкладчыцкай і навуковай дзейнасці; удасканалення прававой адукацыі выкладчыкаў; справядлівых, непрадузятых адносін выкладчыкаў да студэнтаў; складання і ўкаранення сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу кодэксаў (дэкларацый) па пытаннях этыкі і інш.

Пастановай рэкамендавана прафкамам, абласному камітэту прафсаюза вывучыць і разгледзець у II паўгоддзі гг. пытанне аб дзейнасці прафсаюзных арганізацый па ўзмацненні сацыяльнай абароненасці выкладчыцкіх кадраў.

